**ЭКСКУРСІЯ “Апрацоўка лёну, ткацтва”**

**Катэгорыя навучэнцаў:** вучні 5-7 класаў.

**Актуальнасць:** знаёмства з этнаграфічнай спадчынай беларускага народа – умова фарміравання сацыяльна актыўнай асобы-патрыёта.

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з традыцыямі беларускага народа, звязанымі з апрацоўкай ільну.

**Задачы:**

- расказаць пра прылады працы, якімі ў старажытнасці апрацоўвалі лён;
- фарміраваць нагляднa-вобразнае і лагічнае мысленне на базе назірання за музейнымі прадметамі;
- выхоўваць і стымуляваць цікавасць і павагу да культурных здабыткаў свайго народа.

**Абсталяванне:** экспанаты “Беларускай хаткі” і “Залы рамёстваў”

**1 экскурсавод**

Калі зацвітае лён, поле стаіць блакітнае-блакітнае, нібы неба. А як жа з яго атрымліваецца тканіна на кашульку? Усе працэсы, звязаныя з апрацоўкай сыравіны і падрыхтоўкай яе да ткання, выконваліся ўручную – звычайна гэта была жаночая работа. Вельмі важнай культурай для беларусаў быў лён. На тэрыторыі Беларусі лён быў вядомы, па дадзеных археалогіі, у другім стагоддзі да нашай эры. У канцы 19 – пачатку 20 стагоддзя лён быў распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Вырошчвалі лён у кожнай сялянскай гаспадарцы.

**2 экскурсавод**

Для пасева льна выбіралі пэўныя дні тыдня. Лічылася, што лепей за усё сеяць лён у пятніцу або суботу. Рвалі лён у другой палове жніўня. Затым вязалі ў снопікі і ставілі для прасушкі ў “бабкі”. Для абівання льняных галовак карысталіся **пранікам (паказвае).** Для змякчэння трасцы лён рассцілалі на лузе або пожні звычайна ў канцы жніўня, у час вялікіх рос. Пры даждлівым надвор’і саломка вылежвала 3-4 тыдні, пры сухім – 5-6. У некаторых раёнах яе вымочвалі (часам спачатку вымочвалі, а потым рассцілалі). Валокны з мачанца лепш выбельваліся і былі больш моцнымі. Гатовую трасцу звязвалі ў кулі, сушылі ў ёўні, на печы і інш.

**3 экскурсавод**

Ільняная тканіна ішла на вопратку, з ільна ткалі розныя патрэбныя рэчы. Але, каб лён ператварыўся ў гэтыя рэчы, трэба было шмат папрацаваць з ім. Усе працэсы, звязаныя з апрацоўкай ільняной сыравіны і падрыхтоўкай яе да ткання, выконваліся ўручную – звычайна гэта была жаночая работа. У кастрычніку льняное валакно трэба было ачысціць ад кастрыцы. Ці не таму і месяц так называецца – кастрычнік.

**1 экскурсавод**

Далей лён клалі ў церніцу, або **мялку** - прыладу для мяцця льняной ці канаплянай трасцы. Каб канчаткова ачысціць лён ад кастрыцы, яго трэба было трапаць **траплом (паказвае)**, а затым часаць вось на такім **грэбнем (паказвае)**. У выніку атрымлівалі **кудзелю (паказвае)** ці кужаль у залежнасці ад якасці. У лістападзе пачыналі прасці, пралі на працягу ўсяго тыдня за выключэннем святочных дзён і нядзелі. Беларускія жанчыны і дзяўчаты пралі і **верацяном (паказвае)** і на **калаўроце (паказвае).**
У хаце яго шанавалі –

Быў рэччу патрэбнай такой.

Як многа на ім перапралі

Кудзелі і воўны сівой.

Паціху круцілася кола,

І нітка плыла і плыла.

Яго вуркатаннем вясёлым

Напоўнена хата была...

**2 экскурсавод**
Некалькі жанчын збіраліся ў адной хаце, каб сукаць і прасці. Гэтай работай займаліся ў Піліпаўскі пост (з 28 лістапада па 6 студзеня). Гаварылі так: *"Піліпаўскія ночкі надзенуць сарочкі".* Чым лепшай была прадуха, тым танчэйшай у яе атрымоўвалася пража.
**3 экскурсавод**
Пасля таго, як кудзеля была спрадзена, яе адбельвалі. У працэсе адбельвання **маткі** пражы вымочвалі ў шчолаку, паласкалі і развешвалі на сонцы. Часам пражу фарбавалі. Асноўнай сыравінай для фарбавання ў хатніх умовах служылі натуральныя фарбавальнікі: адвары або настоі лісця, кары дрэў, сцяблоў, кветак, каранёў траў. У выніку змешвання розных кампанентаў атрымлівалі патрэбны колер.
**1 экскурсавод**
А потым пачыналі ткаць на кроснах**.** У сакавіку, калі дзень павялічваўся, у хату прыносілі ставы і ўвесь панарад: **ніты, бёрды, чаўнок, набіліцы (паказвае)** і інш. У наладцы красён і ткацтве звычайна ўдзельнічалі 2 – 3 жанчыны.

На кроснах ткалі. Вось гэтыя **пасцілка**, **абрус**, **ручнік (паказвае)** сатканы на кроснах. Палатно вымочвалі, выбівалі пранікам на рэчцы, паласкалі, а затым рассцілалі на роснай траве (прадвеснем на снезе) для бялення пад сонечнымі промнямі.
**2 экскурсавод**
У залежнасці ад валакна і майстэрства ткачыхі палатно атрымлівалася рознай якасці. Самае грубае ішло на мяхі, іншыя гаспадарчыя патрэбы,

тонкае – на адзенне, ручнікі і г.д. Паглядзіце, якія цудоўныя рэчы можна зрабіць на кроснах. Абрусы, ручнікі, спадніцы, фартухі.

**3 экскурсавод**
Паглядзіце, якая спадніца, які фартух. Уявіце, якой прыгожай жанчына была ў гэтай вопратцы на сенажаці ў час жніва. У ёй было яшчэ і ўтульна. Таму што яна выраблена з натуральнага валакна — ільну. Нягледзячы на цяжкія ўмовы жыцця (не было электрычнасці, тэхнікі для апрацоўкі зямлі, адсутнічалі сродкі сувязі), нашы продкі ўмелі ўпрыгожыць свой побыт, умелі весяліцца і адпачываць.

На развітанне пажадаем:

Будзьце здаровы,

Як рыжыкі баровы.

Майце торбу грошай,

Жывіце ў раскошы.

Прыемнага лета!

Здароўя пры гэтым.

І восені яснай,

І долечкі шчаснай.

Дружна жывіце,

Край свой любіце!

## СЛОЎНІК
**Грэбень** - прылада для часання валакна.
**Пранік** – пляскаты драўляны брусок з ручкай, якім абівалі лён.
**Сукала** – прылада для накручвання пражы на цэўку.

**Трапло** – тонкая дошчачка лапатападобнай формы для ачышчэння валакна ад кастрыцы.
**Цэўка** – драўляная палачка з утаўшчэннямі на канцах.

**Чаўнок** - прылада для прапускання нітак, якія накручвалі на цэўку.

**Самапрадка** - прылада для механізаванага прадзення льну і воўны ў хатніх умовах. Прылада для ручнога прадзення льну, воўны, пянькі. У старажытныя часы для гэтага служыла драўляная крыху завостраная палачка даўжынёй 20—30 см з завостраным верхам, патоўшчаным нізам, на які для

павелічэння вагі надзявалі прасліца, і вострай пяткай. Яго выструтвалі нажом або выточвалі з бярозы, ясеню, грушы і інш. На вытачаных прыстасаваннях дзеля зручнасці і як аздабленне наразалі кольцы-паглыбленні.

**Прасніца (з кудзеляй)** - драўляная прылада для прадзення воўны, льняной і пяньковай кудзелі.

**Верацяно** - прылада для ручнога прадзення льну, воўны, пянькі. У старажытныя часы для гэтага служыла драўляная, крыху завостраная палачка даўжынёй 20-30 см з завостраным верхам, патоўшчаным нізам, на які для павелічэння вагі надзявалі прасліца, і вострай пяткай. Яго выстругвалі нажом або выточвалі з бярозы, ясеню, грушы.

**Качалкі –** прыстасаванні для разглажвання тканых вырабаў (бялізны, адзення). Накручаны на качалку выраб раскочвалі валком. Валок - прамы ці выгнуты драўляны брус з нарэзанымі ўпоперак зубцамі знізу і з ручкай.